28. Решетников, Д. Г. География туризма Беларуси : пособие для студентов фак. меж-дунар. отношений,– Минск : БГУ,2012
29. Сельский туризм Беларуси: современное состояние и перспективы развития / Я.И. Аношко [и др.] ; под ред. В.А. Клицуновой. Минск : Четыре четверти, 2011.
30. Стратегия устойчивого развития экологического туризма в Беларуси / Л. М. Гайдукевич [и др.]; под общ. ред. Л. М. Гайдукевича,С. А. Хомич. – Минск : БГУ, 2008.
31. Справочное издание «АГРОЭКОТУРИЗМ: первые шаги». Справочные материалы, 2013
32. Тарасенок А. И. Экологический туризм и рекреационное природопользование в Беларуси : учеб.-метод. пособие. – Минск : ЕГУ, 2003. –120 с.
33. Туристический портал Беларуси [Электронный ресурс] / Режим доступа: http://www.holiday.by/- Дата доступа: 23.11.2014
34. Туристская энциклопедия Беларуси / редкол. : Г. П. Пашков [и др.] ; под общ. ред. И. И. Пирожника. – Минск : Беларус. энцыкл.імя
35. П. Броўкі, 2007
36. Эко- и агротуризм: перспективы развития на локальных территориях [Текст] : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., 18—19 мая 2011 г., г. Барановичи, Респ. Беларусь. / редкол.: В. Н. Зуев (гл.ред.) [и др.]. – Барановичи: РИО БарГУ, 2011.

# РОЛЯ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў СТРАТЭГІЧНЫМ ПЛАНЕ ЗЫГМУНТА СЕРАКОЎСКАГА

**Д. У. Лішай**

Маштабныя баявыя дзеянні патрабуюць наяўнасці дакладнага стратэгічнага плана. Паўстанцам 1863–1864 гг., якія саступалі ў колькасці і прафесійнай падрыхтоўцы расійскай арміі, неабходна было эфектыўна каардынаваць свае аперацыі на вялікай тэрыторыі. Таму план дзеянняў інсургентаў распрацаваў ваенны спецыяліст З.Серакоўскі. Ён жа адводзіў асобную ролю ва ўзброеным выступленні для Мінскай губерні. Але ў паўстанцкім кіраўніцтве адсутнічала адзінства. Рашэнні прымаліся ва ўмовах палемікі паміж «белымі» і «чырвонымі» плынямі кіраўніцтва паўстанцаў. Тэма арганізацыі паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Беларусі і Літвы разглядалася ў даследаваннях гісторыкаў Д.Ч.Матвейчыка [2; 3], В.Ф.Ратча [4], А.Ф.Смірнова [5]. Больш глыбокага вывучэння патрабуе праблематыка ролі Мінскай губерні ў стратэгічным плане З. Серакоўскага.

Па звестках на 11 студзеня 1863 г. на тэрыторыі Беларусі і Літвы размяшчаліся 1-я кавалерыйская дывізія, 1-я конна-артылерыйская брыгада, 1-я, 2-я, 3-я пяхотныя дывізіі, 1-я, 2-я і 3-я палявыя артылерыйскія брыгады, 33-і і 42-і данскія казачыя палкі [6, с. 256]. Колькасны склад расійскай арміі ў Віленскай вайсковай акрузе на чэрвені 1863 г. дасягаў 123,5 тысяч чалавек [2, с. 22]. Улічваючы

прыкладна такія ж сілы расійскай арміі на тэрыторыі Каралеўства Польскага, становіцца зразумелым, што супрацьстаяць ім магла толькі народная армія, пры ўмове належнай арганізацыі, падрыхтоўкі і моцнага баявога духу. У пачатку 1863 г. рэвалюцыйныя арганізацыі Беларусі і Літвы налічвалі каля 3 тысяч чалавек актыўнага складу. У асноўным гэта былі студэнты навучальных устаноў, чыноўнікі і служачыя, прадстаўнікі дробнай шляхты і духавенства [5, с. 116]. Саступаючы расійскай арміі ў колькасці, паўстанцы маглі выкарыстаць веданне мясцовасці, партызанскую тактыку дзеянняў на расцягнутых камунікацыях. Канцэнтруючыся ў буйных населеных пунктах, расійскія войскі не маглі кантраляваць усю тэрыторыю, пазбаўляліся належнай сувязі.

Але ўмовы для прыняцця плана ўзброенай барацьбы ў заходніх губернях былі неспрыяльныя. У лютым–сакавіку 1863 г. Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі быў скасаваны, а замест яго стварыўся Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы [1, с. 47]. Такое рашэнне было прынята пры падтрымцы «белых», якія з'яўляліся праціўнікамі аграрнай рэформы і шырокага ўдзелу народных мас ва ўзброеным выступленні. У склад новага органа ўвайшлі толькі «белыя» на чале з Я.Гейштарам. Яны імкнуліся звузіць сацыяльную базу паўстання, паставіць на камандныя пасады ў ваяводствах і паветах сваіх аднадумцаў [1, с. 47]. Аднак пазіцыі «белых» у Аддзеле правінцыямі Літвы былі нетрывалымі. Паўстанцкія атрады заставаліся прыхільнікамі К. Каліноўскага. У гэтай сітуацыі некаторыя пасады ў Аддзеле правінцыямі Літвы былі перададзены «чырвоным». Галоўнакамандуючым (ваенным ваяводам) паўстанцкімі сіламі на землях былога ВКЛ стаў З.Серакоўскі [2, с. 37]. Сучаснікі адзначалі выдатныя арганізатарскія якасці З.Серакоўскага. Ён здолеў сабраць вакол сябе ваенных спецыялістаў, сярод якіх быў І.Ляскоўскі [7, с. 84]. Больш таго, З.Серакоўскі, з'яўляючыся капітанам Генеральнага штаба, ужо ў сакавіку 1863 г. меў інфармацыю пра меры ўлад, якія збіраліся падавіць паўстанне [4, с. 202].

З.Серакоўскі распрацаваў стратэгічны план развіцця паўстання на новых землях. Прадугледжвалася, што інсургенты замацуюць свае пазіцыі ў Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губернях, дзе адбываліся хваляванні. Сам З.Серакоўскі і І. Ляскоўскі павінны былі накіравацца ў Ковенскую губерню, дзе паўстанне было найбольш моцным. Планавалася ўзняць на ўзброеную барацьбу сялян Курляндыі, незадаволеных панаваннем нямецкіх памешчыкаў. Далей паўстанцы маглі накіравацца на поўдзень – праз Бярэзіну і Усходнюю Беларусь прайсці на Палессе, дзе асаблівасць мясцовасці давалі б магчымасць даўжэй пратрымацца інсургентам. Вынікам такога манеўру магло стаць пашырэнне паўстання на ўсёй тэрыторыі Беларусі і Літвы [2, с. 38].

З.Серакоўскага разлічваў перанесці выступленне на тэрыторыі іншых расійскіх губерняў «ажно да Волгі». Асноўныя расійскія войскі былі сканцэнтраваны ў той час на падаўленні паўстання ў Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай губернях і Каралеўства Польскім, таму марш па Усходняй Беларусі дазволіў бы паўстанцам арганізаваць выступленне фактычна ў тыле ворага [2, с. 38–39 ]. Асобна З.Серакоўскі падкрэсліваў значэнне ахопу выступленнем сялян і вынясенне барацьбы за межы «гістарычнай» Польшчы [5, с. 185].

Зацвярджэнне стратэгіі дзейнасці інсургентаў праходзіла на паседжаннях Аддзелу правінцыямі Літвы ў доўгіх дыскусіях. Я.Гейштар намагаўся перавесці асноўныя сілы паўстанцаў у Віленскую губерню. Такая дэманстрацыі паўстанцкага руху давала б магчымасць чакаць замежнай дапамогі. Але дзейнасць атрадаў тады насіла б пасіўны характар [5, с. 183]. План З.Серакоўскага быў заснаваны не на раздрабленні інсургентаў на шэраг асобных атрадаў. Ён прадугледжваў сканцэнтраванне паўстанцаў у масы, актыўная дзейнасць якіх магла прымусіць замежныя сілы пачаць дапамогу інсургентам [4, с. 202–203]. На паседжаннях Аддзелу правінцыямі Літвы абмяркоўвалася старэнне ў Гродзенскай і Мінскай губернях новых атрадаў, арганізацыя ўзброенага выступлення ва Усходняй Беларусі. Характэрна, што на гэтых паседжаннях адсутнічалі аднадумцы Я.Гейштара [5, с. 184]. Гэты момант пацвярджае жаданне З.Серакоўскага дзейнічаць самастойна ад кансерватыўнай часткі кіраўніцтва Аддзела правінцыямі Літвы.

Асобнае значэнне З.Серакоўскі надаваў Навагрудскаму павету. Мясцовыя паўстанцкія фарміраванні колькасцю ў 150 чалавек павінны былі злучыцца з інсургентамі з Ашмянскага павета і скласці атрад колькасцю ў 300 чалавек. Аб’яднаным сілам двух паветаў неабхода было адцягнуць увагу расійскай арміі з Лідскага павета і даць магчымасць атраду Л.Нарбута, які знаходзіўся ў цяжкім становішчы, перафарміравацца і перайсці ў Гродзенскую губерню на злучэнне з іншымі паўстанцкімі атрадамі [2, с. 59]. У Бабруйскім, Пінскім, Мазырскім і Рэчыцкім паветах паўстанне не паланавалася, па прычыне малой верагоднасці падтрымкі з боку мясцовага насельніцтва [3, с. 80].

Актыўная фаза ўзброенага выступлення на тэрыторыі Мінскай губерні пачалася 19 красавіка 1863 г., што давала магчымасць інсургентам разлічваць на ўдалае развіццё паўстанцкага руху ў краі. Поспех акцыі Л.Звяждоўскага па захопу Горы-Горак першапачаткова садзейнічаў рэалізацыі стратэгічнага плана па пераносу паўстання за межы заходніх губерняў [7, s. 92].

Інсургентамі Мінскай губерні ажыццяўлялася спроба пераходу Бярэзіны для злучэння з паўстанцкімі сіламі Л.Звяждоўскага. Так, у

канцы красавіка 1863 г. інсургенты С.Ляскоўскага і паручыка Снітко перайшлі раку Бярэзіну каля сяла Якшыцы. Падчас руху паўстанцы знішчалі паромы і разбуралі тэлеграфную сувязь. Пасля атрымання звестак пра паражэнне паўстанцаў Л.Звяждоўскага, С.Ляскоўскі і паручык Снітко пачалі адвод сваіх атрадаў з Магілёўскай губерні. Камандзірам паўстанцкіх фарміраванняў стала зразумела, што значнай падтрымкі сярод сялян яны на гэтай тэрыторыі не атрымаюць [5, с. 212].

Аднак часовы поспех пахода Л.Звяждоўскага на Горы-Горкі не быў падмацаваны, што прывяло да зрыву плана З.Сеpакоўскага. Не ўдалося наладзіць і ўзаемадзеянні сіл Магілёўскай і Мінскай губерняў. Паражэнне баявых фарміраванняў З.Серакоўскага каля мястэчка Біржы 25–27 красавіка (7–9 мая) 1863 г. ліквідавала магчымасць сумесных аперацый яго паўстанцаў з інсургентамі Усходяй Беларусі [2, с. 40].

Такім чынам, план З.Серакоўскага прадугледжваў аператыўную арганізацыю ўзброенай барацьбы на тэрыторыі Беларусі і Літвы, правядзення маштабных узброеных выступленняў у краі, перанос паўстанцкага руху ў іншыя губерні Расійскай імперыі. Мінская губерня павінна была актыўна падтрымаць узброенае выступленне. Рознагалосіі па пытаннях стратэгіі і тактыкі інсургентаў у Аддзеле правінцыямі Літвы, адсутнасць падтрымкі з боку сялян, хуткае паражэнне паўстанцкіх атрадаў – усё гэта не дазволіла рэалізаваць стратэгічны план З.Серакоўскага.

**Літаратура**


1. *Кісялёў Г.* Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы / Г. Кісялёў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1: Баларус.энцыкл. / гал.рэд. М.А. Ткачоў. – Мінск, 1993. – С. 47.
2. *Матвейчык Д.* Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў. Мн., 2013.
3. *Матвейчык Д. Ч.* Уладзіслаў Машэўскі і спроба ўзброенага выступлення ў Слуцкім павеце ў 1863 г. / Д.Ч. Матвейчык // Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Беларусі, Літве і Украіне: гісторыя і памяць: зб. на-вук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.: В.В. Яноўская [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; – Мінск, 2014. – С. 79–92.
4. *Ратч В.* Сведения о польском мятеже 1863 г. в Северо-Западной России: в 2 т. Т. 1: Введение. Вильна: Типография губернского правления, 1867. – 260 с
5. *Смирнов А. Ф.* Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. / А.Ф. Смирнов. – Мо-сква: АН СССР, 1963 г. – 391 с.
6. *Тарасаў К.* Памяць пра легенды / К. Тарасаў. – 2-е выд. – Мінск: Полымя, 1993. – 270 с.
7. *Koszczyc W.* Zygmunt Sierakowski – naczeiny wódz Żmudzi w r. 1863 / skreślił Wacław Koszczyc. – Lwów: Towarzystwo imienia Stanisława Staszica, 1891. – 132 s. – (Towarzystwo imienia Stanisława Staszica we Lwowie. R. 3; t. 27–28).